нязменна звяртаюцца да тэмы Другой сусветнай вайны, праз выпрабаванні таго часу ацэньваючы мінулае, сучаснасць і будучыню. Паказальна, што нават сучасныя творы, не звязаныя ні храналагічна, ні тэматычна з тымі векапомнымі падзеямі, так ці інакш перадаюць водгулле таго трагічнага і гераічнага часу і служаць яго ўсведамленню ў рэальна-гістарычным змесце.

**Спіс літаратурных крыніц**

Бы каў В . 36. тв.: У 6 т. Мh., 1992-1993; Быкаў В.У. Выбр. тв. Мн„ 2004.

Л а л іч М . Джына / Пер. М. Паслядовіч // Югаслаўскія апавяданні. Мh., 1975. С. 140-154; Лалйч Михайло. Соч.: В 3 т. / Пер. Т. Вірты, І. Дорбы. М.,1989.

ЛІТАРАТУРА

Лит. обозрение. 1973. № 7. С. 101.

Вопр. литературы. 1976. № 8. С. 150.

Бочаров А. Человек и война. М., 1973. С. 23.

На мовы народаў Югаславіі былі перакпадзены наступныя творы Васіля Быкава: Bikov V. Mrtvi ne cutejo bolecin. Prev. *D2. II* IJubljanski dnevnik, 12.05.1968 - 13.04.1969; Bikov V. Mrtvi ne cutijo bolecin. Iz ruscine prev. Dusan Zeleznov. Ljubljana, 1974; Bikov V. Sotnikov. Povest. Prev. iz ruscine Branko Avsenak. Maribor, 1974; Bikov V. Na ezero. Prev. M. Karanfilovski // Sovremenost (Skopje). 1974. № 7. S. 645-650; Bikov V. Vucji copor. Prev. M.Colic. M.; Beograd$_1$ 1980: Bikov V.V.Znakzla. Sa ruskog prev. D. Jaksic. Beograd; Krusevac, 1986.

Паступіў у рэдакцыю 21.04.05.

*Дзяніс Часлававіч Пашкевіч* - студэнт 5-га курса філалагічнага факультэта.

*Іван Аляксеевіч Чарота* - доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскіх літаратур.

*У.А. НАВУМОВІЧ*

## КАНЦЭПЦЫЯ ЧАЛАВЕКА НА ВАЙНЕ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ: ПРАБЛЕМА ІНТЭЛЕКТУАЛІЗАЦЫІ ПРОЗЫ

Раскрываются пять основных этапов отражения военной темы в белорусской литературе: масштабная, «окопная правда», документалистика, воспоминания женщин и детей, философско-концептуальная проза. В результате интенсивного развития в прозе интеллектуального начала белорусская литература значительно обогатилась в жанрово-стилевом отношении.

Five main stages of war theme reflection in Belarusian literature are revealed: large scale, «trench truth», documentaries, reminiscences of women and children, conceptually philosophic prose. As the result of intensive development of intellectual principles in prose Belarusian literature has been significantly enriched in genre and style.

Незалежнасць Беларусі асветлена Вялікай Перамогай.

Менавіта ў выніку перамаганоснага завяршэння Другой сусветнай вайны за вялікі ўкпад у разгром гітлераўскага фашызму І як рэспубліка, якая найбольш пацярпела ў часы ваеннага ліхалецця, нароўні - Савецкі Саюз, Беларусь і Украіна - атрымалі права суверэннага голасу ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Пад дакументам аб утварэнні ААН стаіць подпіс народнага пісьменніка Беларусі М. Лынькова, які ў складзе дэлегацыі рэспублікі быў на канферэнцыі ў Сан-Францыска, калі было заснавана гэтае аўтарытэтнае міжнароднае калегіяльнае фарміраванне.

У беларускай літаратуры ў пасляваенны час надоўга і трывала запанавала ваенная тэма. Мастацтва слова заклікана раскрываць усю гаму чалавечых адчуванняў. Тэма вайны, цяжкай, непасільнай, руйнуючай не толькі хутары, вёскі, гарады, але і звыклы лад жыцця, людскія душы, была, бадай, адзіным абсягам, дзе галоўны акцэнт адводзіўся гераізму і патрыятызму народа ў святой справе абароны роднай зямлі ад чужаземных захопнікаў.

Доўгі час вайна ў літаратуры малявалася як супрацьстаянне двух светаў, дзвюх ідэалогій - духоўнасці і бездухоўнасці, як выяўленне каштоўнасці чалавечага жыцця, як яшчэ адна спроба зразумець магчымасці чалавека ў вірлівых катакпізмах XX ст. За гэтую асаблівую прывязанасць да ваенных падзей у адрас літаратуры, у тым ліку беларускай, не аднойчы сыпаліся папрокі, што, маўляў, падзеі вайны займаюць зашмат месца ў мастацкіх творах, што ваенная тэма

стала для многіх пісьменнікаў ледзь не своеасаблівай рэлігіяй. Занадта балючымі і цяжкімі былі ўспаміны аб вайне ў народа Беларусі. Таму найбольш трывалае месца ў нашай літаратуры занялі матывы чалавечых страт і чалавечага болю, расчараванняў і пакут, здзекаў І гвалту над чалавечай прыродай, апісанні таго, якімі агромністымі намаганнямі І далека не ўсім удавалася выжыць І застацца людзьмі ў ваеннае ліхалецце.

Для беларускай літаратуры найбольш значныя і трывалыя поспехі надоўга былі звязаны з распрацоўкай вострых і набалелых праблем мінулай вайны. Старажытная зямля Беларусь з яе шматпакутным народам, якая па сваім геапалітычным становішчы знаходзіцца нібы на сямі вятрах і не раз станавілася арэнай крывавых бітваў, здолела ўсё вынесці, перажыць і не зламацца, не загібець, выстаяць.

Адзначым дзеля справядлівасці, што вайна і ваеннае супрацьстаянне маляваліся ў беларускай літаратуры ў розныя часы па-рознаму. Умоўна ў беларускай літаратуры можна вылучыць пяць этапаў у асвятленні падзей мінулай вайны.

*Першы этап* звязаны з паказам вайны перамаганоснай, маштабнай, эпахальнай, вайны народаў, франтоў, ставак, падполля і тылу, вайны партызанскай. Беларусь у такіх творах знаходзілася ўся ў агні пажарышчаў і папялішчаў («У агні» І. Гурскага), малявалася згуртаванасць народаў перад небяспекай усеагульнага вынішчэння («Згуртаванасць» М. Ткачова), паказваліся гераічныя старонкі змагання («Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча, «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона), найбольш удалыя ваенныя аперацыі па вызваленню роднага краю ад ворагаў-чужынцаў («Мінскі напрамак» І. Мележа). Паэтычныя радкі гучалі заклікам да святой барацьбы з захопнікамі («Беларускім партызанам» Я. Купалы, паэма «Беларусь» П. Броўкі). Ваенны час разглядаўся ў такіх творах не іначай як лёсавызначальны, а падзеі, з ім звязаныя, надоўга заставаліся векапомнымі («Векапомныя дні» М. Лынькова).

У такіх творах яшчэ не было месца людскім пачуццям, асабістым бедам, трывогам за заўтрашні дзень, на першым плане - батальныя сцэны, подзвігі герояў, военачальнікаў і камандзіраў. Дзеянні адбываюцца ў глабальным маштабе, у штабах франтоў і зямлянках партызанскіх камандзіраў. На велізарных прасторах, дзе змаганне ішло не на жыццё, а на смерць.

*Другі этап* у распрацоўцы ваеннай тэмы распачаўся ў канцы 1950-х - пачатку 1960-х гг., калі мастакі слова, нарэшце, звярнуліся да суровай праўды ваеннага часу, амаль з дакументальнай дакладнасцю пачалі паказваць жорсткасць, бесчалавечнасць вайны, пакуты чалавека, па-мастацку раскрывалі далёка непрываблівыя карціны вынішчэння ўсяго жывога на зямлі, вытручвання з людскіх душ лепшых пачуццяў, нівеліроўкі характараў. Загаварылі пра кар'ерызм на фронце, траскучую рыторыку пустых заклікаў, некампетэнтнасць камандзіраў, якая абарочвалася гібеллю салдат, пра дэмагагічнасць разважанняў аб нашых перамогах, «шапказакіданне» на пачатку вайны, альбо і проста пра глум над асобай, пралазлівасць, падман, здзек, спробу схавацца за чужымі спінамі, імкненне любой цаной выжыць у крывавай бойні. Гэты этап бярэ пачатак з выхадам у свет аповесці І. Шамякіна «Агонь І снег» - адной з частак кнігі «Трывожнае шчасце».

Менавіта на гэты перыяд прыпадае і прыход у беларускую літаратуру В. Быкава, франтавіка, празаіка вострага і бескампрамісна-праўдзівага, які, здавалася б, «аддаў» іншым пісьменнікам усё - штабы і стаўкі, дзеянне на франтах і ў тыле, але не адступіўся, не забыўся толькі на аднаго, самага галоўнага ўдзельніка вялікай бітвы - радавога байца, простага салдата, на плечы якога і лёг асноўны цяжар вырашэння ваеннага канфлікту.

«Чалавек - работнік на фронце» - вось лейтматыў твораў В. Быкава («Жураўліны крык» (1960), «Трэцяя ракета», «Здрада» (1962), «Пастка» (1965)). Пісьменнік увесь час імкнецца пранікнуць у душу радавога ўдзельніка ваенных аперацый, які мокне і мерзне ў акопчыку, у чыстым полі, у лясным гушчары. І твар байца змарнелы, і харч не падвезлі, і вораг можа з'явіцца ў любы момант, а за каўнер сыплецца пясчаны жвір з акопа, і цябе дабіваюць, дастрэльваюць варожыя салдаты, датоптваюць танкі. З журбой і надзеяй углядаецца баец у высокае неба, чуючы там курлыкание журавоў, усім сэрцам адчуваючы нянавісць да вайны.

*Трэці этап* развіцця літаратуры аб вайне звязаны, як адзначала тагачасная крытыка, з феерычным успleскам дакументалістыкі. З'явілася шмат твораў мемуарнага жанру. Гэта былі дзённікавыя запісы, развагі і літаратурныя апрацоўкі ўспамінаў удзельнікаў ваенных падзей. У іх прываблівала жывая канкрэтыка, рэальнасць, вострая памяць на дэталі быццам ужо далёкага, але яшчэ трывалага ў свядомасці мінулага. Перажыта - ды не забыта. З'яўляюцца мемуары военачальнікаў, камандзіраў, працаўнікоў фронту і тылу. Менавіта на гэты перыяд прыпадае выхад кнігі па-сапраўднаму ўнікальнай - мастацкага дакумента часу, успамінаў выжыўшых ахвяр шматлікіх беларускіх Хатыняў - «Я з вогненнай вёскі» А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка, а таксама другое выданне ўспамінаў дзяцей вайны «Ніколі не забудзем».

На *чацвёртым этапе* пільную ўвагу чытачоў прыцягнуў зварот пісьменнікаў да жаночай і дзіцячай памяці, якая, як аказалася, была надта ўчэпістай, трывалай на жывыя, непасрэдныя ўражанні («Суд у Слабадзе» Б. Казько, «Гандлярка і паэт», «Шлюбная ноч», «Вазьму твой боль» І. Шамякіна).

*Пяты этап* паказу вайны ў беларускай літаратуры выявіў тэндэнцыю да філасофска-інтэлектуальнага асэнсавання тагачасных падзей як усеагульнага нявечання і разбурэння: зямлі, жытла, людскіх душ. Тут трэба назваць аповесці В. Быкава «Знак бяды», «У тумане», «Кар'ер», раманы І. Навуменкі «Сасна пры дарозе» (1962), «Вецер у соснах» (1967), «Сорак трэці» (1974), «Смутак белых начэй» (1980), І. Чыгрынава «Плач перапёлкі" (1972), «Апраўданне крыві» (1977), «Свае і чужыя» (1984) і інш.

Асвятленне падзей вайны ў мастацкай практыцы беларускіх пісьменнікаў праходзіла ў настойлівых пошуках, жаданні «прабіцца» да самога чалавека, імкненні зразумець і спасцігнуць усю паўнату чалавечых адчуванняў у экстрэмальных умовах выпрабавання фізічных і духоўных сіл. Тут прыярытэт належыць В. Быкаву.

Празаік піша пра «сваю» вайну, знаходзячыся «на бестэрміновай перадавой» (А. Адамовіч). Ён гаворыць пра радавых вайны, хто вынес на сваіх плячах увесь цяжар ваеннага ліхалецця, пра «пралетарыят» пярэдняй лініі акопаў, пра тых, хто ідзе ў атаку, пра тых, каго «дабіваюць», «дакалочваюць» мінамі, снарадамі, хто ўзрывае фашысцкія эшалоны на чыгунцы, штурмуе варожыя ўмацаванні. Вось атака, яшчэ атака («Праклятая вышыня»), Пісьменнік вырашае ў сваім творы, што лепш - весці людзей у атаку ці гнаць іх, як на бойню («Яго батальён»). Як прайсці праз выпрабаванні і застацца чалавекам («Пайсці і не вярнуцца»)? Аказваецца, што на вайне многае залежыць ад самога чалавека. Як неабходна ў што б там ні стала дажыць да світання, каб унесці сваю, хай невялікую, але такую неабходную лепту ў агульную перамогу («Дажыць да світання»).

Аповесць «Знак бяды» напоўнена філасофскім зместам. Колькі тут «знакаў» - прыкмет чалавечай бяды. Запусцелы хутар паўстае перад чытачом як знак поўнага вынішчэння ўсяго жывога. Калі прыйшла бяда, нічым яе не спыніць, не адвесці. Дык ці не лепш, каб яе зусім не было.

Аповесць В. Быкава «Сотнікаў» - твор аб узыходжанні і падзенні чалавека: узыходжанні на п'едэстал славы, чалавечнасці, дабра, праўды і ўзыходжанні на эшафот, падзенні ў чорную прорву здрадніцтва, калі, жадаючы перахітрыць «самога сябе», чалавек пайшоў на змову з уласным сумленнем, падман, каб выжыць. Але сам не выратаваўся, а душу прадаў д'яблу, стаў забойцам і ўжо, як збаўлення, шукае смерці.

Маральна-этычныя праблемы аўтару лягчэй было вырашаць на матэрыяле вайны, таму што матэрыял гэты добра знаёмы пісьменніку. Ён усю вайну праваяваў у пяхоце. Імя лейтэнанта В. Быкава было выбіта на абеліску над брацкай магілай, маці атрымала на яго пахавальнае пасведчанне. А ён выжыў.

Пра падзеі на Беларусі ў першыя дні вайны, калі фронт адкаціўся далёка на ўсход, а ў невялічкую вёсачку Верамейкі неўзабаве павінны прыйсці немцы, пра жыццё і барацьбу ў час нямецка-фашысцкай акупацыі расказвае пісьменнік І. Чыгрынаў у раманах «Плач перапёлкі» ($1^{972}$). «Апраўданне крыві» (1977), «Свае і чужыя» (1984), «Не ўсе мы згінем» (1996).

З больш позняй прозы сапраўдным адкрыццём новага мацерыка чалавечага быцця сталі раманы В. Адамчыка «Чужая бацькаўшчына» (1978), «Год нулявы» (1983), «І скажа той, хто народзіцца» (1987), «Голас крыві брата твайго» (1990).

Заслуга В. Быкава ў асвятленні падзей мінулай вайны заключаецца ў тым, што ён паказаў **мяжу чалавечых мажлівасцей,** той водападзел **на рубяжы дабра** і **зла,** калі чалавек яшчэ застаецца Асобай, вартай павагі, і, калі пераступіўшы на бок зла, здраджвае сваім ідэалам. Трэба ўмець памерці ў час. Так на фронце. А ў самім будзённым жыцці? Мастак малюе парогавыя, стрэсавыя, альтэрнатыўныя сітуацыі. Героі пастаянна здаюць экзамен на высокае званне чалавека. Маральны экзамен. Таму творы набываюць прытчападобны змест. Што лягчэй - «пайсці і не вярнуцца» ці «прайсці і застацца»? Любой цаной можна здабываць перамогу? Чаму варта ўсё ж «дажыць да світання»? Ці так ўжо і важна, хто загіне пры выкананні задания?

Пытанні-ідэі. Аповесці-канцэпцыі.

Пачынаўся зусім іншы этап развіцця беларускай прозы. Адбывалася станаўленне філасофска-канцэптуальнай прозы. Раскрываліся лагізіраваныя характары ў лагізіраваных абставінах, ад гэтага канцэптуальнасць твораў літаратуры на вачах узмацнялася.

Творы напаўняліся новым нечаканым зместам, прымушалі думаць і яшчэ раз думаць. Давалі працу розуму. Проза набывала выразна акрэслены духоўны заглыблены інтэлектуальны пачатак.

Інавацыйныя і зусім не звыклыя для традыцыйна сялянскай, беларускай літаратуры тэндэнцыі адкрыла ваенная тэматыка народнага подзвігу, нечакана зрабіўшы пэўны прарыў менавіта ў эстэтычным асвятленні чалавека на вайне ў жанры аповесці - кароткай празаічнай форме з невялікай колькасцю дзеючых асоб.

Мажпіва, што сіла чалавечага духу, сканцэнтраванасць пачуцця ў грозную хвіліну калатнечы дазволілі ў далейшым і мастацкай літаратуры, як «мікраскопам у душу» (Л.М. Талстой), пры «поўным рэалізме» (Ф.М. Дастаеўскі) ваенных дзей знайсці нешта новае ў паводзінах і перажываннях, паўней, выразней, глыбей раскрыць «чалавечае ў чалавеку». Удакладнім, калі мы гаворым пра інтэлектуалізацыю прозы, мы не маем на ўвазе «гульню дэталяў», «эстэтызацыю для эстэтызацыі», «узбуйненае ўяўленне», «зігзагі розуму», хітраспляценні сюжэта, нейкае загадванне і разгадванне псіхалагічных экзерсісаў, выкрыццё таямніц паводзін чалавека ў экстрэмальных сітуацыях. Гэта проза думак, філасофіі паводзін.

Чалавек пазнаецца па ўчынках. Характар асобы мае дзве асноўныя канцэпцыі: біялагічную і сацыяльна-гістарычную. Першая прадугледжвае запраграмаванасць паводзін на генным узроўні, бо ў такім разе характар чалавека застаецца нязменным, а асноўныя яго рысы перадаюцца з пакалення ў пакаленне, што і абумоўлівае яго кансерватыўнасць, нязменнасць, традыцыйнасць. У той жа час другая канцэпцыя бачыць чалавечы характар у руху, у развіцці, сцвярджае, што чалавек схільны змяняцца пад уплывам абставін, часу, сацыяльных І палітычных змен, умоў існавання.

Як першая, так і другая тэндэнцыі нацыянальнага характару ў асаблівым заглыбленні праявіліся ў гады ваеннага супрацьстаяння.

Інтэлектуалізацыя прозы, так бы мовіць, закпікана «адчуць», «зразумець» і «спасцігнуць» «тэорыю душы», механізм чалавечых паводзін, «тэхналогію» яго ўчынкаў, пранікнуць у «тайнае тайных», убачыць і вывесці заканамернасці паводзін асобы ў экстрэмальных умовах. Гэта дазволіла беларускай прозе «выйсці» на новыя мастацкія адкрыцці, адметныя эстэтычныя рубяжы, убачыць чалавека ў новым святле.

Інтэлектуальная проза, такім чынам, асабліва ў дачыненні да раскрыцця канцэпцыі чалавека на вайне, - гэта, найперш, даследаванні не толькі матывацыі паводзін, асяроддзя прабывання, але і экалогіі духу, «паваротаў» псіхалогіі, імкненне зазірнуць у самыя патаемныя куточкі чалавечай душы, куды ён нікога не дапускае, асвятленне такіх парыванняў, эмоцый, пачуццяў, пра існаванне якіх персанаж «баіцца» прызнацца нават сам сабе, бадай, самому сабе ў першую чаргу.

Што ж прымушае Асобу паступаць так ці інакш? Да якіх межаў можа дайсці, па словах Дзмітрыя Карамазава з «Братоў Карамазавых» Ф.М. Дастаеўскага, «камбінацыя пачуццяў чалавечых»?

Інтэлектуалізм прозы - у даследаванні ідэй, якія захапілі душы і сэрцы герояў, аналітыка «формулы душы», вытлумачэнне алгарытма паводзін, спасціжэнне вектара развіцця духу.

«Ідэя, якая стала персанажам, - гэта мастацтва куды больш высокае», - заўважаў Анарэ дэ Бальзак.

Вялікія і значныя ідэі завалодалі мільёнамі людзей, але кожны чалавек на фронце, у партызанах і ў тыле, у час акупацыі паводзіў сябе па-рознаму, таму перад тварам небяспекі ўсяму ёсць месца.

Такім чынам, як вынік актыўнай творчай распрацаванасці ваеннай тэмы ў прозе пісьменніка-франтавіка В. Быкава ў беларускай літаратуры з'явіліся аповесці-канцэпцыі, аповесці-лёсы, аповесці-характары, аповесці-сітуацыі, а таксама аповесці-тэндэнцыі, творы вектарнага развіцця ў больш набліжаным і аддаленым праламленні чалавечых лёсаў - лёсаў народа - лёсаў краіны, а калі паглыбіцца, дык і трываласці ці легказменлівасці, а дно крануць - саміх асноў існуючага ладу, фармацыі, формулы чалавечага суіснавання.

Тэндэнцыя вышэй за факты.

Так можна заключыць з аповесцей В. Быкава, аналізуючы (па Быкаву) сітуацыю «чалавек на вайне», даследуючы характеры яго герояў. Інтэлектуальнасць ваеннай прозы В. Быкава якраз і закпючалася ў смелым праламленні тэндэнцыі самаачышчэння ад усяго павярхоўнага, наноснага як героя, так І самога аўтара, ва «ўхіленні» ад рознага роду ідэалагем, дактрын, палітыкі, якія расплываюцца ў паветры, рассейваюцца, як дым акопаў, калі застаешся сам-насам са смерцю, калі ўглядваешся ў высокае неба, дзе з горка-даўкім курлыканием адплывае жураўліны кпін, патрапіць за якім ты не можаш, нават «прыстроіцца» побач з ім, бо ўсё там размерана-гарманічна, суладна з прыродай. І ты («Я - герой». - *У. Н.)* - сам чалавек - павінен, мусіш, здольны будзеш паступаць толькі ў адпаведнасці са сваёй чалавечай прыродай.

Як мы маглі пераканацца, інтэлектуальны пачатак у ваеннай прозе дазваляў ачысціць, як кажуць, «зерне ад шалупіння», пазбаўляў прозу ідэалагізацыі, зашоранасці, дазваляў шырэй і глыбей, асабліва, у параўнанні з папярэднімі этапамі асвятлення вайны ў беларускай літаратуры, паглядзець на чалавека ў адпаведнасці не толькі з сацыяльна-гістарычнай, але што важней, з біялагічнай (геннай) канцэпцыяй характару персанажаў, убачыць, што ў аснове паводзін чалавека (ад прыроды) - сваё, уласнае, кроўнае, а што набытае, «прышчэпленае», ды не заўсёды трывалае.

«Перелом» у свядомасці, псіхалогіі, паводзінах літаратурных герояў, распачаты ў ваенных аповесцях Быкава, пазбаўленне ад ідэалагічных догмаў, штампаў у пазнейшы час у беларускай літаратуры «пашырылі» аповесці І. Шамякіна «Гандлярка і паэт», «Шлюбная ноч», аповесць А. Карпюка пра каханне ў вайну «Данута», Я. Брыля «Апошняя сустрэча» («Расчараванне»), раманы, аповесці і апавяданні І. Чыгрынава, В. Адамчыка, М. Стральцова, І. Пташнікава, творы У. Караткевіча, А. Адамовіча.

Інтэлектуальная проза засяроджвалася на агульначалавечых каштоўнасцях, і ў гэтым было яе прынцыповае адрозненне ад прозы рэалістычна-канкрэтнай, прыземлена-бытавой, а часам і натуралістычнай. Той часткі літаратуры, што атрымала ўстойлівую характарыстыку ў крытыцы «паўзучы бытавізм» альбо называлася «нашай беларускай цягамоцінай» (П. Дзюбайла), якая грашыла залішняй дэталізацыяй, апісальніцтвам, частым выкарыстаннем літаратурных штампаў. Рэдка які твор абыходзіўся без таго, каб не паказаць партызан, якія чысцяць зброю каля партызанскага кастра; селяніна, які запрагае каня ў фурманку, і, упёршыся каленам у хамут, падцягвае супоню, ці жанчыну, якая заглядвае ў шкпо шыбы ў акне, засланіўшы лоб далоняй, альбо парэпанымі рукамі дастае з печы саганы, таўчэ бульбу. Бытавы фон неабходны, але часам ён станавіўся самамэтай, а дэталізацыя нічога не дадавала да раскрыцця псіхалогіі, да матывацыі паводзін.

Інтэлектуальная проза набывала зусім іншае ўнутранае свячэнне, яна «выпраменьвала» нябачнае ўздзеянне, уражваючы ці ўзвышаючы чытача, творы атрымоўвалі адметнае гучанне, а самі героі займелі ўжо зусім іншую зямную-незямную, а часам адштурхоўваюча-прыцягальную духоўную сілу. Усё на тым жа матэрыяле ваеннага часу Я. Сіпакоў у канцы 1970-1980-х гг. стварае зусім незвычайны сюжэт празаічнага цыкла «Жанчына сярод мужчын» - «Маўклівыя людзі». Як бачым, інтэлектуальная проза стварае і свае непаўторныя сюжэты, малюе сітуацыі парадаксальныя, альтэрнатыўныя, як сёння кажуць, парогавыя, стрэсавыя, амаль неверагодныя. У інтэлектуальнай прозе ішло новае адкрыцце «чалавечага ў чалавеку», дасюль невядомае. Вось узяць хоць бы той жа самы прыклад.

Што ж ляжыць у аснове твора? Гіпертрафіраваная рэўнасць, запаланіўшая ўсю душу, штурхнула Вазьміцеля - так завуць галоўнага героя - на неардынарны ўчынак. Схоплены гітлераўцамі за сувязь з партызанамі, ён і жонку выдае ворагам, мяркуючы, што калі яго не стане на белым свеце, дык яна будзе сустракацца з гэтымі «кабялямі» (так у творы. - У. Н.). А лёсы чалавечыя павярнуліся такім чынам, што ён застаўся жыць, а яе разам з прыёмным сынам пакаралі ворагі. І з таго часу «замольвае» грахі «Вазьміцель чужых жыццяў» - моўчкі з раніцы да позняга вечара пілуючы дровы з сястрой жонкі, якая сварыцца, злуецца, не дае і загаварыць («Маўклівыя людзі»).

Ці магчыма такое? На вайне ўсяму магло быць месца. Свет вялікі, можа быць і такое. Аўтар стварае новую рэальнасць, мажлівае ў мажлівым, малюе логікай мастацкага вымыслу характеры ў лагічна мажлівых абставінах. І ўсё ў творы застаецца рэалістычна-канкрэтным: бытавы фон, будзённая праца, калі героі акучваюць бульбу, нарыхтоўваюць дровы. У творах няма сутыкненняў, «сшибки» (В. Бялінскі) характараў, а ёсць разгортванне філасофскіх сілагем. Вось яны, даследуемыя намі, лагізіраваныя характеры ў лагізіраваных абставінах. Такой паўстае інтэлектуальная проза на рубяжы 1980-1990-х гг.

Інтэлектуальная проза - гэта яшчэ і лірычная проза. Суб'ектыўная, светлая, настраёвая, вельмі і вельмі пластычная. Дзякуючы сваёй глыбокай засяроджанасці на ўнутраных перажываннях персанажаў, інтэлектуальная проза спаўна перадае самыя найтанчэйшыя зрухі ў душы, павароты думак, «зігзагі» памяці, што дазваляла аўтарам угадваць нават «яшчэ не думку», «яшчэ не пачуццё», а толькі іх нараджэнне. Асабліва, калі гаворка ішла пра юнакоў і дзяўчат, для якіх адкрыцці свету рабіліся, наогул, упершыню. Нагадаем героя псіхалагічнага эцюда М. Стрельцова «Ішоў чацьвёрты год вайны», празаічны інтэлектуалізм У. Караткевіча ў кнізе «Блакіт і золата дня», лірыка-рамантычныя экзерсісы ў зборніках прозы Б. Сачанкі «Зямля маіх продкаў», філасофска-псіхалагічныя творы І. Чыгрынава «Птушкі ляцяць на волю», В. Адамчыка «Белы снег». Няма сумнення ў тым, што мастацкае развіццё скандэнсаванасці пачуццяў персанажаў у ваеннай прозе прывяло да значных эстэтычных здабыткаў у літаратуры. Дададзім, што інтэлектуальная проза мае сваю стылістыку.

З'яўляецца «плынь свядомасці», звяртае ўвагу раскаванасць радка, адчуваюцца пластычнасць, рамантызм, узбуйненне фарбаў у раскрыцці розных псіхалагічных станаў душы персанажаў, падкупляюць лірызм і меладраматызм, у празаічных творах больш увагі да маралі, этычных урокаў жыццёвай практыкі, глыбей паўстае філасофія быту і быцця герояў.

З раскрыццём ярка выяўленага інтэлектуальнага пачатку ў прозе беларуская літаратура значна ўзбагацілася ў жанрава-стылёвых адносінах.

Паступіў у рэдакцыю 11.05.05.

*Уладзімір Аляксандравіч Навумовіч* - кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры.